# 12 красавіка 2016 года Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь выпускае ў абарачэнне паштовую марку «Беларускі спадарожнік сувязі «Белінтэрсат-1».

12 красавіка 2016 года Міністэрства сувязі і інфарматызацыі Рэспублікі Беларусь выпускае ў абарачэнне паштовую марку «Беларускі спадарожнік сувязі «Белінтэрсат-1». Марка друкавалася ў РУП «Бабруйская ўзбуйненая друкарня імя А.Ц.Непагодзіна». Дызайн А.Мядзведзь. Стварэнне Нацыянальнай сістэмы спадарожнікавай сувязі і вяшчання – буйнейшы праект у галіне тэлекамунікацыі, які рэалізуецца Рэспублікай Беларусь. Праект валодае высокай інавацыйнай, эканамічнай, сацыяльнай і палітычнай значнасцю для нашай краіны. Рашэнне аб запуску ўласнага спадарожніка сувязі было прынята на самым высокім дзяржаўным узроўні. Па праекце быў абвешчаны закрыты конкурс, пераможцам якога была прызнана кітайская прамысловая карпарацыя «Вялікая сцяна». 15 студзеня 2016 года ў 19:57 па мінскім часе спадарожнік «Белінтэрсат-1» запушчаны з касмадрома Січан (КНР). Праект падрыхтаваны ў супрацоўніцтве з Дзяржаўным ваенна-прамысловым камітэтам Рэспублікі Беларусь. У дзень выпуску паштовай маркі ў абарачэнне ў аддзяленні паштовай сувязі № 1 Мінска (магазін «Філатэлія», вул. Маскоўская, 16) будзе праводзіцца спецыяльнае гашэнне на канверце «Першы дзень». З больш падрабязнай інфармацыяй можна азнаёміцца на сайце РУП "Белпошта" у раздзеле ФілатэліяБелпошта

**Source URL:** *https://mpt.gov.by/news/11-04-2016-239*